«КАЛІ БУДЗЕ РЭЗУЛЬТАТ?»

З такім пытаннем Прэзідэнт Беларусі і Нацыянальнага алімпійскага камітэта Аляксандр Лукашэнка звярнуўся да ўдзельнікаў нарады па пытаннях развіцця летніх відаў спорту. У Нацыянальным алімпійскім камітэце была прааналізаваная работа галіны і абмеркаваны праблемныя моманты.

«Развіццё спорту заўсёды было і застаецца нязменным прыярытэтам нашай дзяржаўнай палітыкі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт адзначыў: «Будзем шчырымі: у летніх відах гэты рэзультат не той, на які краіна мае права разлічваць з улікам узроўню падтрымкі ў гэтай сферы», — заўважыўшы, што годна выступаюць толькі каманды па веславанні на байдарках і каноэ, скачках на батуце, некаторых відах барацьбы, нядрэнна правялі сезон тэнісісткі. «А стральба, гімнастыка, лёгкая атлетыка, фехтаванне, веславанне акадэмічнае, плаванне? — задаў пытанне прысутным. — Чаму гэтыя традыцыйна моцныя для нас віды спорту толькі зрэдку трапляюць на п'едэстал сусветных пяршынстваў? Гульнявыя віды, мяркуючы па ўсім, увогуле туды не імкнуцца».

Спорт — гэта не латарэя, і за кожнай перамогай стаіць вялікая праца многіх прафесіяналаў. «Рэзультат складаецца з рашэння канкрэтных сістэмных пытанняў, па якіх неаднойчы даваліся даручэнні, у тым ліку на нарадзе па зімовых відах спорту ў красавіку гэтага года, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Неабходна забяспечыць максімальную эфектыўнасць дзяржаўных укладанняў у галіну. Калі вызначыліся з прыярытэтнымі відамі спорту — значыць, менавіта туды трэба накіроўваць асноўныя рэсурсы як людскія, так і матэрыяльныя. Прычым рух павінен быць сінхронным на ўсіх узроўнях і ва ўсіх аспектах: у падрыхтоўцы кадраў, спецыялізацыі спартыўных школ, інфармацыйным суправаджэнні і фінансаванні».

Прэзідэнт нагадаў, што ўжо была пастаўлена задача забяспечыць спартыўныя школы інвентаром і абсталяваннем, звярнуў увагу на спартыўную інфраструктуру. Міністру спорту даручана навесці ў гэтых пытаннях парадак.

Яшчэ адна тэма ў галіне — трэнеры. «У асобных відах спорту за апошнія дзесяць гадоў падрыхтавана ў паўтара-два разы больш трэнераў, чым сёння працуе. Дзе астатнія?» — запытаў кіраўнік дзяржавы. «Відавочна, што маладыя спецыялісты застаюцца там, дзе кіраўнік праяўляе зацікаўленасць і стварае ўмовы для працы і жыцця. На плячах трэнера ляжыць асноўная адказнасць за пошук, адбор, падрыхтоўку і матывацыю будучых чэмпіёнаў. З іншага боку, ствараючы для трэнера неабходныя ўмовы, трэба наладзіць эфектыўны кантроль за яго работай, за ўлікам тых, хто займаецца ў спартыўных школах», — сказаў Прэзідэнт.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, як працуюць спартыўныя федэрацыі. Таксама ён сказаў, што неабходна забяспечыць спартсменаў топ-узроўню ўсім неабходным, каб яны паказвалі вынікі. Аднак падрабязней спыніўся і на праблеме допінгу: «Хачу папярэдзіць: ніякіх забароненых методык і прэпаратаў. Гэта неабходна выключыць раз і назаўсёды. Тым больш устаноўлена крымінальная адказнасць за гэта. Адзін антыдопінгавы скандал — і пакутуюць уся краіна і ўсе віды спорту. Вы ведаеце, як пільна за гэтым назіраюць».

Гаворачы пра медыцынскае і навукова-метадычнае суправаджэнне спорту, Прэзідэнт адзначыў, што ў сакавіку наступнага года плануецца адкрыць новы будынак Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра спорту.

Кіраўнік дзяржавы таксама звярнуў увагу на тое, што падчас тэлетрансляцый відаць пустыя трыбуны. На яго думку, не трэба «заганяць» туды людзей. Гэта пытанне да арганізатараў — лепш прапанаваць гэтыя білеты тым, хто не можа іх набыць, — пенсіянерам, людзям з інваліднасцю, дзецям са шматдзетных сем'яў, каб яны маглі пабываць на такіх мерапрыемствах.

«Наперадзе два важныя экзамены — другія Еўрапейскія гульні і Алімпіяда ў Токіа ў 2020 годзе. Для якаснай падрыхтоўкі да гульняў ужо многае зроблена, але ёсць і нявырашаныя пытанні. Неабходна прывесці ў парадак спартыўную інфраструктуру, улічыць усе нюансы, звязаныя з лагістыкай, харчаваннем, медыцынскім суправаджэннем, гарантаваннем бяспекі ўдзельнікаў і гасцей гульняў. Прадумаць усё да дробязей», — звярнуў увагу Прэзідэнт. Ён дадаў: «Гэта маштабнае мерапрыемства, да якога будзе прыцягнута пільная ўвага мільёнаў балельшчыкаў. Па ім будуць судзіць аб нашай краіне. Але не менш важны і спартыўны рэзультат. На хатніх арэнах, пры падтрымцы беларускіх гледачоў нашы атлеты проста абавязаны прадэманстраваць свае найлепшыя здольнасці». Тое ж самае датычыцца і Гульняў у Токіа. «Народ стаміўся чакаць рэзультатаў у гэтай сферы», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Міністр спорту і турызму Сяргей Кавальчук адзначыў, што ў краіне развіваюцца 32 летнія віды спорту. Пасля яго выступлення Аляксандр Лукашэнка зноў звярнуў увагу на галоўнае пытанне: «Калі будзе рэзультат?» Сяргей Кавальчук паабяцаў, што годны рэзультат будзе на адным з найбольш важных стартах наступнага года — другіх Еўрапейскіх гульнях.

Рэктар БДУФК Сяргей Рэпкін расказаў пра ўзровень падрыхтоўкі трэнераў. Гэта тэма разам з выхаваннем маладых спартсменаў стала адной з асноўных на нарадзе. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што змена пакаленняў павінна праходзіць незаўважна.

Галоўны трэнер зборнай Беларусі па мастацкай гімнастыцы Ірына Ляпарская працягнула хвалюючую тэму выхавання маладых трэнераў, адзначыўшы праблему ў сваім відзе спорту. На яе думку, ні новыя палацы, ні пошук таленавітых дзяцей не дапаможа, калі няма каму вучыць. А пакуль існуе такі прабел: дзяўчаты, якія хочуць трэніраваць у мастацкай гімнастыцы, ідуць у БДУФК, але не маюць магчымасці адначасова працаваць з першага курса. За чатыры гады ва ўніверсітэце яны сыходзяць у сумежныя напрамкі, дзе прасцей, і не вяртаюцца трэніраваць у прафесійны спорт. Ірына Ляпарская папрасіла разгледзець магчымасць, каб маладыя спартсменкі, якія завяршаюць сваю кар'еру, маглі б адразу пасля школы станавіцца памочнікамі трэнера ці трэнерамі-стажорамі, каб выбудаваць вертыкаль падрыхтоўкі. Алена Скрыпель, старшыня Беларускай асацыяцыі гімнастыкі, падтрымала яе ў гэтым пытанні. Размова ідзе пра роўныя магчымасці, бо інакш няма зацікаўленасці для трэнераў ісці ў вялікі спорт. Больш лёгкі і прыбытковы варыянт — стварыць ІП. Там менш адказнасці ды большыя заробкі. У такія арганізацыі і сыходзяць маладыя трэнеры. Прэзідэнт даручыў разабрацца з гэтым.

Падводзячы вынікі, кіраўнік дзяржавы адзначыў, звяртаючыся да ўдзельнікаў нарады: «Мы з вамі дамовіліся: ёсць рэзультат — ёсць работа. Няма рэзультату — гарантую, што вы будзеце шукаць працу за межамі Беларусі. Не таму, што вы не далі рэзультат, а таму, што дрэнна ставіцеся да выканання сваіх службовых абавязкаў».

Надзея АНІСОВІЧ.

❍ Каментарый у тэму

Сяргей КАВАЛЬЧУК, міністр спорту і турызму Беларусі:

— Крытыка прагучала ў адрас і Міністэрства спорту, і федэрацый. Яна справядлівая, таму што самая важная мерка нашай дзейнасці — гэта рэзультат. На жаль, рэзультату сёння няма. Глядзім хакей, бачым, як выступае мінскае «Дынама», бачым, як выступае зборная наша па хакеі на ўсіх узроўнях. Грошы ўкладваюцца ў спорт вялікія, а аддачы ад гэтага няма. Нам неабходна працаваць, працаваць і працаваць для таго, каб выйсці з гэтага становішча.

Вадзім ДЗЕВЯТОЎСКІ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы:

— Прэзідэнт вельмі справядліва пытае пра рэзультат, бо тая ўвага, якую аддае дзяржава, многім краінам нават не снілася. Таму, вядома, людзі чакаюць вынікаў. Я сам памятаю, калі быў спартсменам, якую радасць людзі выказвалі, калі прыязджаў у Наваполацк да землякоў. Такі гонар, што беларус стаяў на Алімпійскім п'едэстале.

Ірына ЛЯПАРСКАЯ, галоўны трэнер зборнай Беларусі па мастацкай гімнастыцы:

— Вельмі рада, што мяне пачулі. Гэта не мая асабістая праблема, а праблема будучыні беларускага спорту, і не толькі майго віду. Я думаю, што ўсюды ёсць зараз такая праблема, што трэба зацікавіць спартсменаў застацца ў спорце, стаць добрым трэнерам і прыносіць славу радзіме. Але вельмі цяжка нам іх пакінуць трэнерамі, таму сёння мне прыйшлося папрасіць кіраўніка дзяржавы зрабіць хоць бы такія нязначныя папраўкі, каб дазволіць ім працаваць па заканчэнні спартыўнай кар'еры трэнерамі, не чакаючы атрымання вышэйшай адукацыі. Калі гэта будзе зроблена, я буду вельмі рада. У мяне ёсць такія дзяўчаткі, якія хочуць стаць трэнерамі, але чакаць чатыры гады ні яны, ні я не можам.

Парламенцкі дзённік

Што будучы бюджэт рыхтуе

Павышэнне пенсіі, заробкаў, дапамогі шматдзетным сем'ям — у першым чытанні дэпутаты разгледзелі галоўны фінансавы дакумент года

Не толькі «сацыялка», але і пагашэнне даўгоў (што ўплывае на сусветны імідж краіны) стала прыярытэтам праекта закона. Акрамя бюджэтнага пакета, яшчэ дзясятак законапраектаў разгледзела Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь на пасяджэнні пятай сесіі.

Дзяржаўная «кішэня»

Бюджет 2019 года складзе 23,7 млрд рублёў пры расходнай частцы — 22 млрд. Акрамя таго, пастаўлена задача забяспечыць сярэдні заробак у бюджэтнай сферы да канца наступнага года ў суадносінах 80 % да сярэдняга па краіне.

Сцэнарый бюджэту на наступны год, па словах першага намесніка міністра фінансаў Юрыя Селіверстава, такі: тэмп росту ВУП 102,1 %, інфляцыя 5,3 %, цана нафты, закладзеная ў бюджэт, — 60 долараў за барэль.

Паводле слоў **старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Людмілы ДАБРЫНІНАЙ**, бюджэт 2019 года мае свае асаблівасці. «Мы заўсёды падкрэсліваем, што бюджэт захоўвае сваю сацыяльную накіраванасць, — сказала яна. — У прыватнасці, прадугледжваецца рост заработнай платы ў бюджэтнай сферы».

Акрамя павелічэння заработнай платы, у прыярытэце падтрымка шматдзетных сем'яў, грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. На адукацыю ў наступным годзе будзе выдзелена амаль на 15 % больш грошай, чым у 2018-м, на ахову здароўя — на 12,6 %. У цэлым з бюджэту на гэтыя мэты прадугледжваецца 6,4 і 5,4 млрд рублёў.

«Што датычыцца пенсій, то пастаўлена задача на 2019 год выйсці на суадносіны 40 % да сярэднямесячнай заработнай платы. Для гэтага сярэднегадавы тэмп росту пенсіі складзе больш за 114 %. Адпаведна, будзе пераразлік пенсій, якія ўвязаны з бюджэтам пражытковага мінімуму, — гэта штоквартальны пераразлік. Таксама прадугледжаны рост дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей», — праінфармавала **міністр працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь Ірына КАСЦЕВІЧ.**

Змяняюцца падыходы да фінансавання і падтрымкі рэальнага сектара эканомікі. Як паведаміла Людміла Дабрыніна, на 10 % скарочана ў бюджэце менавіта гэтая падтрымка. Вызваленыя сродкі накіроўваюцца на фінансаванне сацыяльнай сферы. «Сёння акцэнт ставіцца на павышэнне эфектыўнасці работы дзяржсектара. Шмат зроблена ў мінулыя гады па мадэрнізацыі канкрэтных галін, і сёння ўжо ёсць аддача», — адзначыла старшыня камісіі.

Прыярытэтам таксама з'яўляецца пагашэнне ўнутранага і знешняга доўгу. На гэта выдаткоўваецца 5,7 млрд рублёў і часткова пойдзе прафіцыт бюджэту. На закрыццё даўгоў плануецца накіроўваць увазныя мытныя пошліны на нафтапрадукты. На канец 2019 года дзярждоўг складзе 55,1 млрд рублёў (або 41,6 % да ВУП пры крытычным значэнні 45 %).

На субсідаванне «камуналкі» накіроўваецца 541 млн рублёў з улікам павышэння тарыфаў. На развіццё сельскай гаспадаркі плануецца выдаткаваць 863,3 млн рублёў.

Усе звышпланавыя даходы бюджэту пры ўмове работы эканомікі па мэтавым сцэнарыі будуць акумуляваныя ў рэзервовым фондзе кіраўніка дзяржавы. Такія сродкі накіроўваюцца на найбольш значныя сацыяльныя праекты рашэннем Прэзідэнта.

Дэпутаты звярнулі ўвагу на сітуацыю з падатковым манеўрам Расійскай Федэрацыі. У даходах бюджэту кампенсацыя з боку Расіі не прадугледжана. Бюджэт сфарміраваны па даходах, як і ў мінулыя гады. Сцэнарый сёння базавы і адаптаваны пад развіццё эканомікі краіны.

Навацыі Падатковага кодэкса

Прыпыненне аперацый на рахунку, згодна з абноўленым дакументам, будзе праводзіцца зыходзячы з добрасумленнасці плацельшчыка. Калі ён на працягу паўгоддзя адказна выконваў абавязкі, яму дадуць час для пагашэння доўгу 5—10 дзён. Таксама ўрэгуляваныя пытанні спагнання дэбіторскай запазычанасці, налічэння пені, удакладненыя тэрміны і перыяды правядзення залікаў па падатках.

«Мы ведаем, што існуе шэраг праблем у гаспадарчай дзейнасці, калі прыпыненне аперацый па рахунках блакуе ўсю дзейнасць прадпрыемстваў. Гэтыя пытанні ўрэгуляваны. Падатковыя органы пайшлі насустрач бізнесу», — паведаміла **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Людміла НІЖЭВІЧ.**

Вырашана адна з галоўных задач, якая была пастаўлена Прэзідэнтам, — дакумент, нягледзячы на яго аб'ём, просты ў выкарыстанні, лічыць дэпутат. Былі выключаны няўзгодненасці, няяснасці. Для гэтага, па словах Людмілы Ніжэвіч, сістэмна прапрацаваны раздзелы, часткі і артыкулы.

«Гэты дакумент — вынік працы вялікага калектыву супрацоўнікаў дзяржаўных органаў з прыцягненнем бізнес-супольнасці, незалежных экспертаў. Гэта дакумент прамога дзеяння, прыняцце падзаконных актаў для рэалізацыі нормаў, закладзеных у праекце Падатковага кодэкса, не спатрэбіцца. Шэраг нормаў, якія раней рэгуляваліся рашэннем Прэзідэнта, уключаны ў Падатковы кодэкс», — сказала дэпутат.

Перагледжаныя пытанні, звязаныя з інвестыцыйнымі вылікамі па падатках на прыбытак, па павышаючым каэфіцыенце на маёмасныя падаткі ў адносінах да незавершанага будаўніцтва — з 2020 года каэфіцыент будзе не 2,5 %, а 2 %. Адмяняецца з 2019 года павышаючы каэфіцыент за неэфектыўнае выкарыстанне маёмасці.

Яшчэ аб інвестыцыях

Таксама дэпутаты расказалі аб працы ў кірунку развіцця прыцягальнага інвестыцыйнага клімату. Асноўным новаўвядзеннем закона аб інвестыцыях і прыватызацыі з'яўляецца дадатковая абарона правоў уласнасці інвестараў пры ўкладанні сродкаў у эканоміку Рэспублікі Беларусь. Для гэтага вызначаны парадак кампенсацыі маёмасці ў выпадку нацыяналізацыі і рэквізіцыі і працэдура замацавання ў інвестыцыйных дагаворах магчымасці разгляду спрэчак у міжнародных судах.

Усяго на пасяджэнні разгледзелі звыш дзесяці законапраектаў у першым і другім чытанні: аб пытаннях пітнога водазабеспячэння, рэгістры насельніцтва і гарантаванні пагранічнай бяспекі. Акрамя таго, ратыфікавалі пагадненні аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве паміж ЕАЭС і КНР, часовае пагадненне, якое вядзе да стварэння зоны свабоднага гандлю паміж ЕАЭС і Іранам.

Марыя ДАДАЛКА.